*Трэці этап гістарыяграфіі* (70-я гг. XIX ст. – пачатак 20-х гг. XX стст.) адзначаны ўзрастаннем якасці навуковых матэрыялаў, яны становяца больш дакладнымі, падрабязнымі, аўтары прыводзяць разам з агульным апісаннем святочнага дзеяння і выконваемы пры гэтым тэкст, гукавы рад, фіксуючы такім чынам рытуальны канон: грунтоўныя працы Ю. Крачкоўскага (1869, 1873), І. Бермана (1869–73), П. Бяссонава (1871), К. Тышкевіча (1871), Ф. Сурына (1873), В. Навіцкага (1873), І. Насовіча (1873), П. Шэйна (1874), М. Валатоўскага (1878), А. Васільевай (1877–80), А. Дэмбавецкага (1882), З. Радчанкі (1883), З. Глогера (1883), П. Янчука (1889), М. Доўнар-Запольскага (1893), Е. Вітарта (1897), М. Федароўскага (1897–1903). Пры тым адбывалася першаснае асэнсаванне адзінства, цэласнасці шматтэматычных звестак традыцыйнага календара. Праз этнамузыказнаўчыя даследаванні была выяўлена строгая храналагічная прымеркаванасць пэўных груп песенных і музычных твораў, што фарміравала разуменне комплекснасці і структуіраванасці пабудовы календара. На дадзеным этапе пашыраліся і мэты даследванняў: непасрэдныя апісанні набывалі досыць планамерны, амаль ўсеахопліваючы па тэрыторыі Беларусі характар (як у храналагічна-абрадавам, так і ў тэрытарыяльным планах). Побач з імі з’яўляліся значныя аналітычныя агляды, дзе напрацоўваліся новыя метадычныя падыходы, уводзілася аналітыка сацыялагічнага і этнапсіхалагічнага зместу. Перыяд да канца XIX ст. бачыца найбольш плённым адносна колькасці і якасці зафіксаваных на Беларусі матэрыялаў. Для іх характэрна тэматычная паўната звестак, выніковыя спробы вылучэння абрадавай структуры каляндарных падзей і абрадаў, іх першаснай класіфікацыі, асэнсавання іх вытокаў, агульнай пабудовы, узаемасувязей.

У цэлым – фарміраваўся мясцовы этналагічны накірунак, праз які нараджаліся арыгінальныя канцэпцыі этнагенэзу беларусаў. Засвойваліся метады параўнальна-гістарычнага даследвання, сістэматызацыі дадзеных, правядзення этнічна-параўнальнага аналізу (пераважна на мяжы Беларусі і Расіі) – на падставе звестак аб старажытных вераваннях, адлюстраваных, у тым ліку, і ў народным календары: У. Дабравольскі, (1903), Я. Карскі (1916), інш. Але маштабы мэтанакіраванага ўжывання каляндарнай спадчыны ў іншых навуковых галінах, у тым ліку ў гісторыі, нельга прызнаць задавальняючымі. Таксама, адзначанае пашырэнне навуковых падыходаў не прывяло да якасных змен у абшары спецыяльных даследванняў самога календара (як прыклад такіх пошукаў – праца М. Ласіеўскага (1878), са сціплай спробай спалучыць напрамкі рэлігіязнаўства і астраноміі). У асноўным, вывучэнне народнага календара абмяжоўвалася даследваннем яго рытуальнай складаючай, пераважна ў накірунку старажытных вераванняў. Гэты падыход

на беларускім матэрыяле паступова праходзіў шлях ад эмацыянальнага да гістарычна абгрунтаванага, скіраванага на сістэматызавае вылучэнне характэрных рыс сакральнага свету беларусаў: А. Кіркор (1882), А. Багдановіч (1895), У. Дабравольскі (1898, 1903), Н. Нікіфароўскі (1899, 1907), А. Сержпутоўскі (1907).

З розных рэгіёнаў беларускай этнічнай тэрыторыі паходзіць багаты каляндарна-абрадавы матэрыял, сабраны П. Шэйнам і яго шматлікімі карэспандэнтамі. У двух тамах трохтомнага збору фалькларыста прадстаўлены грунтоўныя апісанні ўсіх відаў каляндарных звычаяў і абрадаў беларусаў. З асаблівай паўнатой і паслядоўнасцю зафіксаваны каляндарна-абрадавы комплекс у «Беларускім зборніку» (1886–1912) Е. Раманава. Звычаі, абрады, песні ў ім пададзены па рэгіёнах, што дазваляе наглядна бачыць распаўсюджанне таго ці іншага абраду, песеннай разнавіднасці па ўсім этнічным беларускім абшары. Рэгіянальны каляндарны звычаёва-абрадавы матэрыял надрукаваны Е. Раманавым у рэдагаваным ім зборніку «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911–1912). Значны след ў беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі другой паловы 19 ст. (у тым ліку ў вывучэнні каляндарнай абраднасці) пакінуў М. Нікіфароўскі.

Этапнай з’явілася 3-х-томная фундаментальная праца Я. Карскага (1903–1922) «Беларусы», дзе ўпершыню прадпрынята спроба абагульніць і сістэматызаваць назапашаныя звесткі, правесці цэласнаю класіфікацыю календарных песень, і вылучыць асноўны змест абрадаў, з адзнакай гістарычнага кантэксту. Я. Карскі ажыццявіў першае тэарэтычнае даследаванне асноўных жанраў беларускага фальклору, іх паэтыкі. У развіцці каляндарных свят, абрадаў і звычаяў беларусаў даследчык вылучыў два асноўныя этапы. Першы этап, на яго думку, ахопліваў старажытную, дахрысціянскую эпоху, другі – хрысціянскую. У старажытную эпоху паслядоўнасць і час свят, іх звычаяў і абрадаў былі абумоўлены зменай пор года, зімнім і летнім сонцазваротам. На першым этапе вялікае значэнне надавалася не толькі сімвалічнаму дзеянню (абраду), але і суправаджаючай яго песні. На другім этапе развіцця святочных традыцый час спраўлення каляндарных свят вызначаўся хрысціянскім календаром. Каляндарныя святы былі прымеркаваны да хрысціянскіх: Каляды – да Ражаства Хрыстова, Купала – да дня Іаана Хрысціцеля, валачобныя абрады – да хрысціянскага свята Вялікадня. На другім этапе развіцця святочных традыцый аслабляецца ранейшая строгая сувязь абрада і песні.

У 19 ст. у фалькларыстыцы існавалі розныя навуковыя напрамкі – школы або тэорыі: міфалагічная, міграцыйная, гістарычная і інш. Міфалагічная і міграцыйная тэорыі ўзніклі ў славянскай фалькларыстыцы пад уплывам

заходнееўрапейскіх вучоных, гістарычная зарадзілася ў Расіі і распаўсюдзілася ў іншых краінах.

У 19 – пачатку 20 ст. быў сабраны багаты фальклорна-этнаграфічны матэрыял, які з’явіўся грунтоўнай базай для глыбокіх тэарэтычных даследаванняў беларускай народна-паэтычнай творчасці, што бяруць пачатак з «Беларусаў» Я. Карскага.

*Міфалагічная школа*, кірунак у фалькларыстыцы і этнаграфіі 19 ст., прыхільнікі якога надавалі міфалогіі універсальнае значэнне як крыніцы культуры і прыцягвалі яе да тлумачэння паходжання і сэнсу фальклорных і этнаграфічных з’яў. Асноўныя палажэнні міфалагічнай школы распрацавалі браты Я. і В. Грым, А. Кун (Германія), М. Мюлер (Англія). Яны разглядалі вераванні, паданні, песні, казкі, легенды і інш. як рэшткі старажытнага, т.зв. міфалагічнага светапогляду, які нібыта быў заснаваны на ўвасабленні нябесных з’яў – сонца, месяца, хмар, грому і інш. Гэтыя ўвасабленні, на іх погляд, былі багамі, якім пакланяліся. Меркавалі, што з цягам часу такая рэлігійна-міфалагічная сістэма пачала разбурацца і ранейшыя багі ператварыліся ў казачных персанажаў (жывёл, людзей і інш.). На думку вучоных, рэшткі міфалагічнага светапогляду захаваліся ў народных звычаях і абрадах, сутнасць іх часта тлумачылі памылкова. Асновай народнага светапогляду прадстаўнікі міфалагічнай школы лічылі міф. Прыхільнікамі гэтай тэорыі ў Расіі былі А.М. Афанасьеў, Ф.І. Буслаеў, А.Ф. Мілер, А.А. Патабня і інш. На Беларусі была пануючым кірункам 1-й паловы і ў 60–70-я г. 19 ст. З пазіцый міфалагічнай школы напісаны этнаграфічныя працы П. Шпілеўскага, які адмаўляў эвалюцыю беларускай народнай культуры. Тыя ж погляды падзяляў і А. Кіркор. П. Шэйн на аснове прынцыпаў міфалагічнай школы склаў «Праграму для збірання помнікаў народнай творчасці» (1867), зборнік «Беларускія народныя песні» (1874). У зборніку «Беларускія песні» (1871) П. Бяссонаў частку старажытных беларускіх звычаяў і абрадаў памылкова выводзіў з хрысціянскай міфалогіі, тлумачыў іх яе матывамі.

Метадалогія і высновы міфалагічнай школы, якія заснаваны на ідэалізацыі міфалогіі і перабольшванні яе ролі ў гісторыі культуры, падвяргаліся крытыцы. Аднак міфалагічная школа адыграла важную ролю ў актывізацыі збірання і вывучэння фальклору, этнаграфічных матэрыялаў, росце цікавасці да народнай культуры.

*Гістарычная школа*, адзін з кірункаў рускай фалькларыстыкі канца 19 – пачатку 20 ст. Яе тэарэтычныя асновы сфармуляваны У. Мілерам у «Нарысах рускай народнай славеснасці» (т. 1, 1897), развіты і дапоўнены ў працах М.

Спяранскага, С. Шамбінага, Б. Сакалова. У адрозненне ад міфалагічнай школы і міграцыйнай тэорыі (тэорыя запазычвання, або вандроўных сюжэтаў) прадстаўнікі гістарычнай школы імкнуліся растлумачыць фальклор, апіраючыся на гісторыю, пазнаць побыт народа, суаднесці факты, падзеі, імёны народнай паэзіі з рэальнымі, з тымі, што мелі месца ў мінулым. У рэканструкцыі эпічных цыклаў яны ішлі ад твораў позняга паходжання да больш ранніх, старажытных. У былінах і гістарычных песнях прыхільнікі гістарычнай школы бачылі фрагменты своеасаблівага вуснага летапісу, несупадзенні гістарычных падзей і зместу твораў тлумачылі скажэннямі вуснага пераказу ў выніку бытавання ў сялянскім асяроддзі. Вялікае значэнне надавалі індывідуальнаму пачатку ў фальклоры, але ў некаторых выпадках перабольшвалі, абсалютызавалі яго. Недаацэньвалі ролю народных мас у стварэнні духоўных каштоўнасцей, прыпісвалі паходжанне былін выключна княжацка-дружыннаму асяроддзю. Пры многіх метадалагічных недахопах гістарычная школа зрабіла прыкметны ўклад у навуку пра фальклор, стварыла гістарычную геаграфію рускага эпасу, сабрала і абагульніла значны матэрыял. Школа карысталася міжнародным аўтарытэтам і паўплывала на вучоных шэрагу краін. Як накірунак распалася ў сярэдзіне 1920-х г. Асобныя яе прадстаўнікі ў 1920–1930-я г. унеслі ў яе метад сацыяльны пачатак. Аб’ектыўная ацэнка дзейнасці гістарычнай школы зроблена ў 1960-я г. У зборніках і даследаваннях, выдадзеных прадстаўнкамі гістарычнай школы (М. Анучкоў, А. Маркаў, А. Грыгор’еў, М. Ціхаміраў, У. Мілер, браты Б. і Ю. Сакаловы), ёсць блізкія да беларускіх варыянты і паралелі эпічных твораў, пераважна казкі і гістарычныя песні, якія ў розны час былі запісаны на Беларусі (пазней сабраны ў кнізе «Беларускі эпас», 1959). У беларускай фалькларыстыцы гістарычны падыход да вусна-паэтычнай творчасці абазначыўся ў працы І. Храпавіцкага «Погляд на паэзію беларускага народа» (1845). Ідэі гістарычнай школы падзялялі М. Янчук і Я. Карскі.

*Рускае геаграфічнае таварыства*, заснавана ў Санкт-Пецярбургу ў 1845. Вяло актыўнае і планамернае збіранне этнаграфічных матэрыялаў на Беларусі ў другой палове 19 – пачатку 20 ст. Этнаграфічнае аддзяленне РГТ распрацавала ў 1847–49 і разаслала па ўсёй краіне, у тым ліку ў беларускія губерні, спецыяльную праграму, адказы на пытанні якой часткова былі надрукаваны. У першым выпуску «Этнографического сборника» (Спб., 1853) была надрукавана праца І. Юркевіча «Острынскі прыход Віленскай губерні Лідскага павета», у другім выпуску гэтага выдання (Спб., 1854) – звод матэрыялаў, дасланых з Віцебскай губерні («Быт беларускіх сялян»), у якім асноўнае месца займаюць ап *Трэці этап гістарыяграфіі* (70-я гг. XIX ст. –

пачатак 20-х гг. XX стст.) адзначаны ўзрастаннем якасці навуковых матэрыялаў, яны становяца больш дакладнымі, падрабязнымі, аўтары прыводзяць разам з агульным апісаннем святочнага дзеяння і выконваемы пры гэтым тэкст, гукавы рад, фіксуючы такім чынам рытуальны канон: грунтоўныя працы Ю. Крачкоўскага (1869, 1873), І. Бермана (1869–73), П. Бяссонава (1871), К. Тышкевіча (1871), Ф. Сурына (1873), В. Навіцкага (1873), І. Насовіча (1873), П. Шэйна (1874), М. Валатоўскага (1878), А. Васільевай (1877–80), А. Дэмбавецкага (1882), З. Радчанкі (1883), З. Глогера (1883), П. Янчука (1889), М. Доўнар-Запольскага (1893), Е. Вітарта (1897), М. Федароўскага (1897–1903). Пры тым адбывалася першаснае асэнсаванне адзінства, цэласнасці шматтэматычных звестак традыцыйнага календара. Праз этнамузыказнаўчыя даследаванні была выяўлена строгая храналагічная прымеркаванасць пэўных груп песенных і музычных твораў, што фарміравала разуменне комплекснасці і структуіраванасці пабудовы календара. На дадзеным этапе пашыраліся і мэты даследванняў: непасрэдныя апісанні набывалі досыць планамерны, амаль ўсеахопліваючы па тэрыторыі Беларусі характар (як у храналагічна-абрадавам, так і ў тэрытарыяльным планах). Побач з імі з’яўляліся значныя аналітычныя агляды, дзе напрацоўваліся новыя метадычныя падыходы, уводзілася аналітыка сацыялагічнага і этнапсіхалагічнага зместу. Перыяд да канца XIX ст. бачыца найбольш плённым адносна колькасці і якасці зафіксаваных на Беларусі матэрыялаў. Для іх характэрна тэматычная паўната звестак, выніковыя спробы вылучэння абрадавай структуры каляндарных падзей і абрадаў, іх першаснай класіфікацыі, асэнсавання іх вытокаў, агульнай пабудовы, узаемасувязей.

У цэлым – фарміраваўся мясцовы этналагічны накірунак, праз які нараджаліся арыгінальныя канцэпцыі этнагенэзу беларусаў. Засвойваліся метады параўнальна-гістарычнага даследвання, сістэматызацыі дадзеных, правядзення этнічна-параўнальнага аналізу (пераважна на мяжы Беларусі і Расіі) – на падставе звестак аб старажытных вераваннях, адлюстраваных, у тым ліку, і ў народным календары: У. Дабравольскі, (1903), Я. Карскі (1916), інш. Але маштабы мэтанакіраванага ўжывання каляндарнай спадчыны ў іншых навуковых галінах, у тым ліку ў гісторыі, нельга прызнаць задавальняючымі. Таксама, адзначанае пашырэнне навуковых падыходаў не прывяло да якасных змен у абшары спецыяльных даследванняў самога календара (як прыклад такіх пошукаў – праца М. Ласіеўскага (1878), са сціплай спробай спалучыць напрамкі рэлігіязнаўства і астраноміі). У асноўным, вывучэнне народнага календара абмяжоўвалася даследваннем яго рытуальнай складаючай, пераважна ў накірунку старажытных вераванняў. Гэты падыход на беларускім матэрыяле паступова праходзіў шлях ад эмацыянальнага да

гістарычна абгрунтаванага, скіраванага на сістэматызавае вылучэнне характэрных рыс сакральнага свету беларусаў: А. Кіркор (1882), А. Багдановіч (1895), У. Дабравольскі (1898, 1903), Н. Нікіфароўскі (1899, 1907), А. Сержпутоўскі (1907).

З розных рэгіёнаў беларускай этнічнай тэрыторыі паходзіць багаты каляндарна-абрадавы матэрыял, сабраны П. Шэйнам і яго шматлікімі карэспандэнтамі. У двух тамах трохтомнага збору фалькларыста прадстаўлены грунтоўныя апісанні ўсіх відаў каляндарных звычаяў і абрадаў беларусаў. З асаблівай паўнатой і паслядоўнасцю зафіксаваны каляндарна-абрадавы комплекс у «Беларускім зборніку» (1886–1912) Е. Раманава. Звычаі, абрады, песні ў ім пададзены па рэгіёнах, што дазваляе наглядна бачыць распаўсюджанне таго ці іншага абраду, песеннай разнавіднасці па ўсім этнічным беларускім абшары. Рэгіянальны каляндарны звычаёва-абрадавы матэрыял надрукаваны Е. Раманавым у рэдагаваным ім зборніку «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911–1912). Значны след ў беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі другой паловы 19 ст. (у тым ліку ў вывучэнні каляндарнай абраднасці) пакінуў М. Нікіфароўскі.

Этапнай з’явілася 3-х-томная фундаментальная праца Я. Карскага (1903–1922) «Беларусы», дзе ўпершыню прадпрынята спроба абагульніць і сістэматызаваць назапашаныя звесткі, правесці цэласнаю класіфікацыю календарных песень, і вылучыць асноўны змест абрадаў, з адзнакай гістарычнага кантэксту. Я. Карскі ажыццявіў першае тэарэтычнае даследаванне асноўных жанраў беларускага фальклору, іх паэтыкі. У развіцці каляндарных свят, абрадаў і звычаяў беларусаў даследчык вылучыў два асноўныя этапы. Першы этап, на яго думку, ахопліваў старажытную, дахрысціянскую эпоху, другі – хрысціянскую. У старажытную эпоху паслядоўнасць і час свят, іх звычаяў і абрадаў былі абумоўлены зменай пор года, зімнім і летнім сонцазваротам. На першым этапе вялікае значэнне надавалася не толькі сімвалічнаму дзеянню (абраду), але і суправаджаючай яго песні. На другім этапе развіцця святочных традыцый час спраўлення каляндарных свят вызначаўся хрысціянскім календаром. Каляндарныя святы былі прымеркаваны да хрысціянскіх: Каляды – да Ражаства Хрыстова, Купала – да дня Іаана Хрысціцеля, валачобныя абрады – да хрысціянскага свята Вялікадня. На другім этапе развіцця святочных традыцый аслабляецца ранейшая строгая сувязь абрада і песні.

У 19 ст. у фалькларыстыцы існавалі розныя навуковыя напрамкі – школы або тэорыі: міфалагічная, міграцыйная, гістарычная і інш. Міфалагічная і міграцыйная тэорыі ўзніклі ў славянскай фалькларыстыцы пад уплывам

заходнееўрапейскіх вучоных, гістарычная зарадзілася ў Расіі і распаўсюдзілася ў іншых краінах.

У 19 – пачатку 20 ст. быў сабраны багаты фальклорна-этнаграфічны матэрыял, які з'явіўся грунтоўнай базай для глыбокіх тэарэтычных даследаванняў беларускай народна-паэтычнай творчасці, што бяруць пачатак з «Беларусаў» Я. Карскага.

*Міфалагічная школа*, кірунак у фалькларыстыцы і этнаграфіі 19 ст., прыхільнікі якога надавалі міфалогіі універсальнае значэнне як крыніцы культуры і прыцягвалі яе да тлумачэння паходжання і сэнсу фальклорных і этнаграфічных з'яў. Асноўныя палажэнні міфалагічнай школы распрацавалі браты Я. і В. Грым, А. Кун (Германія), М. Мюлер (Англія). Яны разглядалі вераванні, паданні, песні, казкі, легенды і інш. як рэшткі старажытнага, т.зв. міфалагічнага светапогляду, які нібыта быў заснаваны на ўвасабленні нябесных з'яў – сонца, месяца, хмар, грому і інш. Гэтыя ўвасабленні, на іх погляд, былі багамі, якім пакланяліся. Меркавалі, што з цягам часу такая рэлігійна-міфалагічная сістэма пачала разбурацца і ранейшыя багіператварыліся ў казачных персанажаў (жывёл, людзей і інш.). На думку вучоных, рэшткі міфалагічнага светапогляду захаваліся ў народных звычаях і абрадах, сутнасць іх часта тлумачылі памылкова. Асновай народнага светапогляду прадстаўнікі міфалагічнай школы лічылі міф. Прыхільнікамі гэтай тэорыі ў Расіі былі А.М. Афанасьеў, Ф.І. Буслаеў, А.Ф. Мілер, А.А. Патабня і інш. На Беларусі была пануючым кірункам 1-й паловы і ў 60–70-я г. 19 ст. З пазіцый міфалагічнай школы напісаны этнаграфічныя працы П. Шпілеўскага, які адмаўляў эвалюцыю беларускай народнай культуры. Тыя ж погляды падзяляў і А. Кіркор. П. Шэйн на аснове прынцыпаў міфалагічнай школы склаў «Праграму для збірання помнікаў народнай творчасці» (1867), зборнік «Беларускія народныя песні» (1874). У зборніку «Беларускія песні» (1871) П. Бяссонаў частку старажытных беларускіх звычаяў і абрадаў памылкова выводзіў з хрысціянскай міфалогіі, тлумачыў іх яе матывамі.

Метадалогія і высновы міфалагічнай школы, якія заснаваны на ідэалізацыі міфалогіі і перабольшванні яе ролі ў гісторыі культуры, падвяргаліся крытыцы. Аднак міфалагічная школа адыграла важную ролю ў актывізацыі збірання і вывучэння фальклору, этнаграфічных матэрыялаў, росце цікавасці да народнай культуры.

*Гістарычная школа*, адзін з кірункаў рускай фалькларыстыкі канца 19 – пачатку 20 ст. Яе тэарэтычныя асновы сфармуляваны У. Мілерам у «Нарысах рускай народнай славеснасці» (т. 1, 1897), развіты і дапоўнены ў працах М.

Сперанскага, С. Шамбінага, Б. Сакалова. У адрозненне ад міфалагічнай школы і міграцыйнай тэорыі (тэорыя запазычвання, або вандроўных сюжэтаў) прадстаўнікі гістарычнай школы імкнуліся растлумачыць фальклор, апіраючыся на гісторыю, пазнаць побыт народа, суаднесці факты, падзеі, імёны народнай паэзіі з рэальнымі, з тымі, што мелі месца ў мінулым. У рэканструкцыі эпічных цыклаў яны ішлі ад твораў позняга паходжання да больш ранніх, старажытных. У былінах і гістарычных песнях прыхільнікі гістарычнай школы бачылі фрагменты своеасаблівага вуснага летапісу, несупадзенні гістарычных падзей і зместу твораў тлумачылі скажэннямі вуснага пераказу ў выніку бытавання ў сялянскім асяроддзі. Вялікае значэнне надавалі індывідуальнаму пачатку ў фальклоры, але ў некаторых выпадках перабольшвалі, абсалютызавалі яго. Недаацэньвалі ролю народных мас у стварэнні духоўных каштоўнасцей, прыпісвалі паходжанне былін выключна княжацка-дружыннаму асяроддзю. Пры многіх метадалагічных недахопах гістарычная школа зрабіла прыкметны ўклад у навуку пра фальклор, стварыла гістарычную геаграфію рускага эпасу, сабрала і абагульніла значны матэрыял. Школа карысталася міжнародным аўтарытэтам і паўплывала на вучоных шэрагу краін. Як накірунак распалася ў сярэдзіне 1920-х г. Асобныя яе прадстаўнікі ў 1920–1930-я г. унеслі ў яе метад сацыяльны пачатак. Аб’ектыўная ацэнка дзейнасці гістарычнай школы зроблена ў 1960-я г. У зборніках і даследаваннях, выдадзеных прадстаўнкамі гістарычнай школы (М. Анучкоў, А. Маркаў, А. Грыгор’еў, М. Ціхаміраў, У. Мілер, браты Б. і Ю. Сакаловы), ёсць блізкія да беларускіх варыянты і паралелі эпічных твораў, пераважна казкі і гістарычныя песні, якія ў розны час былі запісаны на Беларусі (пазней сабраны ў кнізе «Беларускі эпас», 1959). У беларускай фалькларыстыцы гістарычны падыход да вусна-паэтычнай творчасці абазначыўся ў працы І. Храпавіцкага «Погляд на паэзію беларускага народа» (1845). Ідэі гістарычнай школы падзялялі М. Янчук і Я. Карскі.

*Рускае геаграфічнае таварыства*, заснавана ў Санкт-Пецярбургу ў 1845. Вяло актыўнае і планамернае збіранне этнаграфічных матэрыялаў на Беларусі ў другой палове 19 – пачатку 20 ст. Этнаграфічнае аддзяленне РГТ распрацавала ў 1847–49 і разаслала па ўсёй краіне, у тым ліку ў беларускія губерні, спецыяльную праграму, адказы на пытанні якой часткова былі надрукаваны. У першым выпуску «Этнографического сборника» (Спб., 1853) была надрукавана праца І. Юркевіча «Острынскі прыход Віленскай губерні Лідскага павета», у другім выпуску гэтага выдання (Спб., 1854) – звод матэрыялаў, дасланых з Віцебскай губерні («Быт беларускіх сялян»), у якім асноўнае месца займаюць апісанні, прысланыя вольнаадпушчаным селянінам

М. Анімеле. У трэцім выпуску (Спб., 1858) выйшлі дзве працы: А. Кіркора «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» і Куклінскага «Нататкі пра заходнюю частку Гродзенскай губерні».

У 1867 у Вільні быў створаны Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства, які адыграў значную ролю ў этнаграфічным і фалькларыстычным вывучэнні Беларусі (функцыяніраваў да 1875 і ў 1910–14). Распрацаваныя і разасланыя ім па ўсёй Беларусі праграмы і анкеты садзейнічалі ўключэнню ў этнаграфічную работу мясцовай інтэлігенцыі. З РГТ былі звязаны збіральнікі і даследчыкі беларускага фальклору А. Кіркор, С. Максімаў, І. Насовіч, М. Дзмітрыеў, І. Берман, П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, З. Радчанка, У. Дабравольскі, М. Доўнар-Запольскі і інш.

ісанні, прысланыя вольнаадпушчаным селянінам М. Анімеле. У трэцім выпуску (Спб., 1858) выйшлі дзве працы: А. Кіркора «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» і Куклінскага «Нататкі пра заходнюю частку Гродзенскай губерні».

У 1867 у Вільні быў створаны Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства, які адыграў значную ролю ў этнаграфічным і фалькларыстычным вывучэнні Беларусі (функцыяніраваў да 1875 і ў 1910–14). Распрацаваныя і разасланыя ім па ўсёй Беларусі праграмы і анкеты садзейнічалі ўключэнню ў этнаграфічную работу мясцовай інтэлігенцыі. З РГТ былі звязаны збіральнікі і даследчыкі беларускага фальклору А. Кіркор, С. Максімаў, І. Насовіч, М. Дзмітрыеў, І. Берман, П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, З. Радчанка, У. Дабравольскі, М. Доўнар-Запольскі і інш.

*Трэці этап гістарыяграфіі* (70-я гг. XIX ст. – пачатак 20-х гг. XX стст.) адзначаны ўзрастаннем якасці навуковых матэрыялаў, яны становяца больш дакладнымі, падрабязнымі, аўтары прыводзяць разам з агульным апісаннем святочнага дзеяння і выконваемы пры гэтым тэкст, гукавы рад, фіксуючы такім чынам рытуальны канон: грунтоўныя працы Ю. Крачкоўскага (1869, 1873), І. Бермана (1869–73), П. Бяссонава (1871), К. Тышкевіча (1871), Ф. Сурына (1873), В. Навіцкага (1873), І. Насовіча (1873), П. Шэйна (1874), М. Валатоўскага (1878), А. Васільевай (1877–80), А. Дэмбавецкага (1882), З. Радчанкі (1883), З. Глогера (1883), П. Янчука (1889), М. Доўнар-Запольскага (1893), Е. Вітарта (1897), М. Федароўскага (1897–1903). Пры тым адбывалася першаснае асэнсаванне адзінства, цэласнасці шматтэматычных звестак традыцыйнага календара. Праз этнамузыказнаўчыя даследаванні была выяўлена строгая храналагічная прымеркаванасць пэўных груп песенных і музычных твораў, што фарміравала разуменне комплекснасці і структуіраванасці пабудовы календара. На дадзеным этапе пашыраліся і мэты даследванняў: непасрэдныя апісанні набывалі досыць планамерны, амаль

ўсеахопліваючы па тэрыторыі Беларусі характар (як у храналагічна-абрадавам, так і ў тэрытарыяльным планах). Побач з імі з’яўляліся значныя аналітычныя агляды, дзе напрацоўваліся новыя метадычныя падыходы, уводзілася аналітыка сацыялагічнага і этнапсіхалагічнага зместу. Перыяд да канца XIX ст. бачыца найбольш плённым адносна колькасці і якасці зафіксаваных на Беларусі матэрыялаў. Для іх характэрна тэматычная паўната звестак, выніковыя спробы вылучэння абрадавай структуры каляндарных падзей і абрадаў, іх першаснай класіфікацыі, асэнсавання іх вытокаў, агульнай пабудовы, узаемасувязей.

У цэлым – фарміраваўся мясцовы этналагічны накірунак, праз які нараджаліся арыгінальныя канцэпцыі этнагенэзу беларусаў. Засвойваліся метады параўнальна-гістарычнага даследвання, сістэматызацыі дадзеных, правядзення этнічна-параўнальнага аналізу (пераважна на мяжы Беларусі і Расіі) – на падставе звестак аб старажытных вераваннях, адлюстраваных, у тым ліку, і ў народным календары: У. Дабравольскі, (1903), Я. Карскі (1916), інш. Але маштабы мэтанакіраванага ўжывання каляндарнай спадчыны ў іншых навуковых галінах, у тым ліку ў гісторыі, нельга прызнаць задавальняючымі. Таксама, адзначанае пашырэнне навуковых падыходаў не прывяло да якасных змен у абшары спецыяльных даследванняў самога календара (як прыклад такіх пошукаў – праца М. Ласіеўскага (1878), са сціплай спробай спалучыць напрамкі рэлігіязнаўства і астраноміі). У асноўным, вывучэнне народнага календара абмяжоўвалася даследваннем яго рытуальнай складаючай, пераважна ў накірунку старажытных вераванняў. Гэты падыход на беларускім матэрыяле паступова праходзіў шлях ад эмацыянальнага да гістарычна абгрунтаванага, скіраванага на сістэматызавае вылучэнне характэрных рыс сакральнага свету беларусаў: А. Кіркор (1882), А. Багдановіч (1895), У. Дабравольскі (1898, 1903), Н. Нікіфароўскі (1899, 1907), А. Сержпутоўскі (1907).

З розных рэгіёнаў беларускай этнічнай тэрыторыі паходзіць багаты каляндарна-абрадавы матэрыял, сабраны П. Шэйнам і яго шматлікімі карэспандэнтамі. У двух тамах трохтомнага збору фалькларыста прадстаўлены грунтоўныя апісанні ўсіх відаў каляндарных звычаяў і абрадаў беларусаў. З асаблівай паўнатой і паслядоўнасцю зафіксаваны каляндарна-абрадавы комплекс у «Беларускім зборніку» (1886–1912) Е. Раманава. Звычаі, абрады, песні ў ім пададзены па рэгіёнах, што дазваляе наглядна бачыць распаўсюджанне таго ці іншага абраду, песеннай разнавіднасці па ўсім этнічным беларускім абшары. Рэгіянальны каляндарны звычаёва-абрадавы матэрыял надрукаваны Е. Раманавым у рэдагаваным ім зборніку «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911–1912). Значны след ў беларускай

фалькларыстыцы і этнаграфіі другой паловы 19 ст. (у тым ліку ў вывучэнні каляндарнай абраднасці) пакінуў М. Нікіфароўскі.

Этапнай з’явілася 3-х-томная фундаментальная праца Я. Карскага (1903–1922) «Беларусы», дзе ўпершыню прадпрынята спроба абагульніць і сістэматызаваць назапашаныя звесткі, правесці цэласнаю класіфікацыю календарных  песень, і вылучыць асноўны змест абрадаў, з адзнакай гістарычнага кантэксту. Я. Карскі ажыццявіў першае тэарэтычнае даследаванне асноўных жанраў беларускага фальклору, іх паэтыкі. У развіцці каляндарных свят, абрадаў і звычаяў беларусаў даследчык вылучыў два асноўныя этапы. Першы этап, на яго думку, ахопліваў старажытную, дахрысціянскую эпоху, другі – хрысціянскую. У старажытную эпоху паслядоўнасць і час свят, іх звычаяў і абрадаў былі абумоўлены зменай пор года, зімнім і летнім сонцазваротам. На першым этапе вялікае значэнне надавалася не толькі сімвалічнаму дзеянню (абраду), але і суправаджаючай яго песні. На другім этапе развіцця святочных традыцый час спраўлення каляндарных свят вызначаўся хрысціянскім календаром. Каляндарныя святы былі прымеркаваны да хрысціянскіх: Каляды – да Ражаства Хрыстова, Купала – да дня Іаана Хрысціцеля, валачобныя абрады – да хрысціянскага свята Вялікадня. На другім этапе развіцця святочных традыцый аслабляецца ранейшая строгая сувязь абрада і песні.

У 19 ст. у фалькларыстыцы існавалі розныя навуковыя напрамкі – школы або тэорыі: міфалагічная, міграцыйная, гістарычная і інш. Міфалагічная і міграцыйная тэорыі ўзніклі ў славянскай фалькларыстыцы пад уплывам заходнееўрапейскіх вучоных, гістарычная зарадзілася ў Расіі і распаўсюдзілася ў іншых краінах.

У 19 – пачатку 20 ст. быў сабраны багаты фальклорна-этнаграфічны матэрыял, які з’явіўся грунтоўнай базай для глыбокіх тэарэтычных даследаванняў беларускай народна-паэтычнай творчасці, што бяруць пачатак з «Беларусаў» Я. Карскага.

*Міфалагічная школа*, кірунак у фалькларыстыцы і этнаграфіі 19 ст., прыхільнікі якога надавалі міфалогіі універсальнае значэнне як крыніцы культуры і прыцягвалі яе да тлумачэння паходжання і сэнсу фальклорных і этнаграфічных з’яў. Асноўныя палажэнні міфалагічнай школы распрацавалі браты Я. і В. Грым, А. Кун (Германія), М. Мюлер (Англія). Яны разглядалі вераванні, паданні, песні, казкі, легенды і інш. як рэшткі старажытнага, т.зв. міфалагічнага светапогляду, які нібыта быў заснаваны на ўвасабленні нябесных з’яў – сонца, месяца, хмар, грому і інш. Гэтыя ўвасабленні, на іх погляд, былі багамі, якім пакланяліся. Меркавалі, што з цягам часу такая

рэлігійна-міфалагічная сістэма пачала разбурацца і ранейшыя багі ператварыліся ў казачных персанажаў (жывёл, людзей і інш.). На думку вучоных, рэшткі міфалагічнага светапогляду захаваліся ў народных звычаях і абрадах, сутнасць іх часта тлумачылі памылкова. Асновай народнага светапогляду прадстаўнікі міфалагічнай школы лічылі міф. Прыхільнікамі гэтай тэорыі ў Расіі былі А.М. Афанасьеў, Ф.І. Буслаеў, А.Ф. Мілер, А.А. Патабня і інш. На Беларусі была пануючым кірункам 1-й паловы і ў 60–70-я г. 19 ст. З пазіцый міфалагічнай школы напісаны этнаграфічныя працы П. Шпілеўскага, які адмаўляў эвалюцыю беларускай народнай культуры. Тыя ж погляды падзяляў і А. Кіркор. П. Шэйн на аснове прынцыпаў міфалагічнай школы склаў «Праграму для збірання помнікаў народнай творчасці» (1867), зборнік «Беларускія народныя песні» (1874). У зборніку «Беларускія песні» (1871) П. Бяссонаў частку старажытных беларускіх звычаяў і абрадаў памылкова выводзіў з хрысціянскай міфалогіі, тлумачыў іх яе матывамі.

Метадалогія і высновы міфалагічнай школы, якія заснаваны на ідэалізацыі міфалогіі і перабольшванні яе ролі ў гісторыі культуры, падвяргаліся крытыцы. Аднак міфалагічная школа адыграла важную ролю ў актывізацыі збірання і вывучэння фальклору, этнаграфічных матэрыялаў, росце цікавасці да народнай культуры.

*Гістарычная школа*, адзін з кірункаў рускай фалькларыстыкі канца 19 – пачатку 20 ст. Яе тэарэтычныя асновы сфармуляваны У. Мілерам у «Нарысах рускай народнай славеснасці» (т. 1, 1897), развіты і дапоўнены ў працах М. Спяранскага, С. Шамбінага, Б. Сакалова. У адрозненне ад міфалагічнай школы і міграцыйнай тэорыі (тэорыя запазычвання, або вандроўных сюжэтаў) прадстаўнікі гістарычнай школы імкнуліся растлумачыць фальклор, апіраючыся на гісторыю, пазнаць побыт народа, суаднесці факты, падзеі, імёны народнай паэзіі з рэальнымі, з тымі, што мелі месца ў мінулым. У рэканструкцыі эпічных цыклаў яны ішлі ад твораў позняга паходжання да больш ранніх, старажытных. У былінах і гістарычных песнях прыхільнікі гістарычнай школы бачылі фрагменты своеасаблівага вуснага летапісу, несупадзенні гістарычных падзей і зместу твораў тлумачылі скажэннямі вуснага пераказу ў выніку бытавання ў сялянскім асяроддзі. Вялікае значэнне надавалі індывідуальнаму пачатку ў фальклоры, але ў некаторых выпадках перабольшвалі, абсалютызавалі яго. Недаацэньвалі ролю народных мас у стварэнні духоўных каштоўнасцей, прыпісвалі паходжанне былін выключна княжацка-дружыннаму асяроддзю. Пры многіх метадалагічных недахопах гістарычная школа зрабіла прыкметны ўклад у навуку пра фальклор, стварыла гістарычную геаграфію рускага эпасу, сабрала і абагульніла значны матэрыял.

Школа карысталася міжнародным аўтарытэтам і паўплывала на вучоных шэрагу краін. Як накірунак распалася ў сярэдзіне 1920-х г. Асобныя яе прадстаўнікі ў 1920–1930-я г. унеслі ў яе метад сацыяльны пачатак. Аб'ектыўная ацэнка дзейнасці гістарычнай школы зроблена ў 1960-я г. У зборніках і даследаваннях, выдадзеных прадстаўнкамі гістарычнай школы (М. Анучкоў, А. Маркаў, А. Грыгор'еў, М. Ціхаміраў, У. Мілер, браты Б. і Ю. Сакаловы), ёсць блізкія да беларускіх варыянты і паралелі эпічных твораў, пераважна казкі і гістарычныя песні, якія ў розны час былі запісаны на Беларусі (пазней сабраны ў кнізе «Беларускі эпас», 1959). У беларускай фальклярыстыцы гістарычны падыход да вусна-паэтычнай творчасці абазначыўся ў працы І. Храпавіцкага «Погляд на паэзію беларускага народа» (1845). Ідэі гістарычнай школы падзялялі М. Янчук і Я. Карскі.

*Рускае геаграфічнае таварыства*, заснавана ў Санкт-Пецярбургу ў 1845. Вяло актыўнае і планамернае збіранне этнаграфічных матэрыялаў на Беларусі ў другой палове 19 – пачатку 20 ст. Этнаграфічнае аддзяленне РГТ распрацавала ў 1847–49 і разаслала па ўсёй краіне, у тым ліку ў беларускія губерні, спецыяльную праграму, адказы на пытанні якой часткова былі надрукаваны. У першым выпуску «Этнографического сборника» (Спб., 1853) была надрукавана праца І. Юркевіча «Острынскі прыход Віленскай губерні Лідскага павета», у другім выпуску гэтага выдання (Спб., 1854) – звод матэрыялаў, дасланых з Віцебскай губерні («Быт беларускіх сялян»), у якім асноўнае месца займаюць апісанні, прысланыя вольнаадпушчаным селянінам М. Анімеле. У трэцім выпуску (Спб., 1858) выйшлі дзве працы: А. Кіркора «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» і Куклінскага «Нататкі пра заходнюю частку Гродзенскай губерні».

У 1867 у Вільні быў створаны Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства, які адыграў значную ролю ў этнаграфічным і фальклярыстычным вывучэнні Беларусі (функцыяніраваў да 1875 і ў 1910–14). Распрацаваныя і разасланыя ім па ўсёй Беларусі праграмы і анкеты садзейнічалі ўключэнню ў этнаграфічную работу мясцовай інтэлігенцыі. З РГТ былі звязаны збіральнікі і даследчыкі беларускага фальклору А. Кіркор, С. Максімаў, І. Насовіч, М. Дзмітрыеў, І. Берман, П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, З. Радчанка, У. Дабравольскі, М. Доўнар-Запольскі і інш.